*Ю. В. Кішкурна,*
*старшы навуковы супрацоўнік,*
*Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны*
*музей Якуба Коласа (Беларусь)*

# СПАСЦІЖЭННЕ ШЛЯХУ ДА ДУХОЎНАЙ СВЯТАСЦІ: ВОБРАЗ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Засваенне гісторыі Айчыны патрабуе асэнсавання ролі нашых славутых продкаў у духоўным станаўленні асобы і шырэй – у фарміраванні генетычнага кода этнасу. Вытлумачэнне гістарычных падзей і фактаў адбываецца праз свядомасць сучаснага чалавека, пошукі ў мінулым вытокаў высакародных рыс сваёй нацыі (спагадлівасці, мэтанакіраванай волі, адданасці ў пачуццях і мужнасці ўчынкаў). Праблема адметнай аўтарскай інтэрпрэтацыі летапіснага і мастацкага вобраза жанчыны-легенды ў беларускай літаратуры вырашаецца неадназначна і мае шматстайнае асэнсаванне ў залежнасці ад ідэйнай накіраванасці твора і яго родава-жанравай прыналежнасці.

Асоба Еўфрасінні Полацкай, хрысціянскай святой, заступніцы зямлі беларускай, невыпадкова стала аб’ектам шырокага гістарычнага вывучэння і мастацкага ўвасаблення. Унучка полацкага князя Усяслава Чарадзея, цёзка ўдавы Уладзіміра Чырвонае Сонейка, яна з годнасцю прайшла наканаваны лёсам шлях – шлях самаахвярнага служэння народу і Бацькаўшчыне. «Сваім пранікнёным словам і асабістым прыкладам Еўфрасіння адыгрывала неацэнную ролю ў выхаванні высокіх духоўных пачуццяў і патрыятычных памкненняў сваіх суайчыннікаў» [3, с. 242].

Адзіным фактаграфічным «дакументам», які ўтрымлівае канкрэтныя звесткі пра лёс асветніцы, з’яўляецца «Жыціе Еўфрасінні Полацкай», створанае, верагодней за ўсё, у канцы XII – першай палове XIII ст. невядомым аўтарам (на думку даследчыкаў даўняй беларускай літаратуры В. Чамярыцкага і Л. Гараніна, у яго складанні «браў удзел “слуга” Еўфрасінні Міхаіл, магчыма, ігумен мужчынскага манастыра, заснаванага падзвіжніцай у Полацку» [1, с. 105]). Помнік створаны паводле канонаў агіяграфічнага жанру, таму вобраз Еўфрасінні ў ім ідэалізаваны і, нягледзячы на прысутнасць пэўных побытавых рэалій і біяграфічных фактаў, мала індывідуалізаваны. У адпаведнасці з выкладзенымі ў творы ранняга Сярэднявечча звесткамі нашы сучаснікі − знаўца агіяграфічнай літаратуры А. Мельнікаў, а пазней пісьменнікі У. Арлоў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Марціновіч − напісалі прысвечаныя асветніцы гісторыка-літаратурныя нарысы, якія ў многім падштурхнулі айчынных творцаў да пераасэнсавання старажытнай фактaлагічнай асновы. Індывідуальна-аўтарскае тлумачэнне падзей гісторыі, жыцця і дзейнасці канкрэтнага персанажа (у дадзеным выпадку знакавай постаці беларускай культуры) становіцца таксама адным са спосабаў філасофскага заглыблення ў свет чалавека, рэфлексій над надзённымі і вечнымі праблемамі.

Мастацкае ўвасабленне жыццёвага подзвігу святой Еўфрасінні надзвычай align разнабаковае як у канцэптуальным плане, так і ў плане зместу і формы. Да ўвекавечання вобраза асветніцы спрычыніліся многія айчынныя літаратары, абраўшы для гэтага пэўную жанрава-стылёвую форму, у рамках якой спалучаюцца, з аднаго боку, даныя гістарычнай навукі, а з другога − творчы вымысел аўтара. Вобраз Еўфрасінні Полацкай у беларускім слоўным мастацтве прадстаўлены творамі пісьменнікаў розных літаратурных пакаленняў і светапоглядных арыентацый: прыпавесць В. Ластоўскага «Разбойнік», апавяданне С. Тарасава «Фрэскі», аповесць В. Іпатавай «Прадыслава», раманы А. Асіпенкі «Святыя грэшнікі», А. Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае», Т. Бондар «Спакуса», В. Коўтун «Пакліканыя», п’есы А. Дударава «Крыж», А. Петрашкевіча «Крыж святой Еўфрасінні», вершы С. Грахоўскага, Я. Мальчэўскай, А. Бембеля, Е. Лось, Р. Барадуліна, Д. Бічэль-Загнетавай, В. Зуёнка, А. Разанава, В. Жуковіча, І. Багдановіч, Л. Рублеўскай, Н. Гальпяровіча, Л. Тарасюк, У. Пецюкевіча, інш.

Аповесць «Прадыслава» Вольгі Іпатавай (1971) у час свайго напісання была першым эпічным творам, які адкрыў асобу Еўфрасінні Полацкай для чытача-беларуса. У адрозненне ад агіяграфічнага ўзнаўлення вобраза знакамітай палачанкі пісьменніца стварыла не ідэалізаваны, узвышаны воблік святой, а індывідуалізаваны, напоўнены духоўнымі перажываннямі і ваганнямі характар – жанчыны, князёўны, манашкі, ігуменні. Твор В. Іпатавай стаў свайго роду сучаснай інтэрпрэтацыяй «Жыція Еўфрасінні Полацкай», рамантычнай гісторыяй жыцця Прадыславы-Еўфрасінні. «Вольга Іпатава на аснове старажытнага твора напісала новае “Жыціе”, у цэнтры якога не святая Еўфрасіння, а Еўфрасіння-жанчына, зямная, зразумелая» [6, с. 10], – робіць выснову даследчыца гістарычнай прозы пісьменніцы І. Дамарад. Як вынікае з тэксту аповесці, лёс Еўфрасінні, яе зямное прызначэнне – гэта сілай слова і ўласнага прыкладу весці людзей да ісціны, да ўсведамлення каштоўнасці і перавагі духоўнага пачатку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзеля гэтага варта было ахвяраваць каханнем, зямным жаночым шчасцем, несучы вечна жывы дух мудрасці, які застаўся ў кнігах, у словах, што перажываюць вякі, вучаць дабрыні і справядлівасці, паказваюць шлях выхаду з духоўнай цемры.

Не адыходзячы ад кананічнай версіі «Жыція», Таіса Бондар у рамане «Спакуса» (1989) стварае вобраз мэтанакіраванай, духоўна моцнай асобы, якая служыць роднаму краю і народу. Выбар Прадславы паміж жыццём свецкім і духоўным пісьменніца тлумачыць наступным чынам: *«Любоўю сваёй хачу я зло і няверʼе выкараняць, словам Божым хачу мір зямлі гэтай вымаліць»* [4, с. 16]. Згодна з Т. Бондар, адчуванне абранасці, Богам дадзенай святасці, духоўнасці арганічна паяднана з усёй істотай Еўфрасінні, злучана непарыўнай повяззю з унутраным самаадчуваннем ігуменні: *«Музыка стагоддзяў – не, музыка душы чалавечай, што стагоддзямі прагнула вырвацца з палону кволага, грахоўнага цела! – лілася <…> яна рвалася з грудзей»* [4, с. 166]. Мадэрнавасць Т. Бондар заключаецца ў адлюстраванні фізіялагічных адчуванняў Еўфрасінні як жанчыны, яе падсвядомага імкнення да рэалізацыі плоцевага пачатку. Аднак нельга не пагадзіцца са словамі даследчыцы Т. Грамадчанкі, што «покліч плоці ў гераіні Т. Бондар успрымаецца ўсё ж як эпатаж: Еўфрасіння ў нейкія хвіліны зайздросціць блудніцы» [5, с. 209].

Твор Валянціны Коўтун «Пакліканыя» (2002) уяўляе сабой раман-біяграфію жыццёвага шляху Еўфрасінні Полацкай, крыніцай для напісання якога стала «Жыціе». У рамане прыведзены малітвы, вытрымкі са Святога Пісання, дзякуючы якім выразна прасочваецца духоўная эвалюцыя Еўфрасінні ад «пакліканай» да «выбранай». Аўтар засяроджвае ўвагу не на святасці манашкі, а на подзвігу духу зямной жанчыны, усе намаганні, справы якой былі здзейснены дзякуючы Боскай прадвызначанасці. Гераіня твора жыве шматгранным унутраным жыццём, яе вобраз прасякнуты глыбокім псіхалагізмам, раскрываецца праз маналогі, рэфлексію. «У рамане В. Коўтун, − па словах Т. Грамадчанкі, − вобраз знакамітай асветніцы зазямляецца, але не зніжаецца, аўтар падкрэслівае, які цяжкі і цярністы шлях да ідэалу ў зямнога чалавека, якога самаадрачэння патрабуе Боская любоў да бліжняга» [5, с. 208]. Еўфрасіння спасцігла вышэйшую ісціну: хрысціянская любоў чыстая і першародная ў кожным чалавеку, і патэнцыйныя магчымасці асобы дазваляюць пранесці яе такой праз усе спакусы і выпрабаванні часу.

У пʼесе Аляксея Дударава «Крыж» (2000) праз паказ нязменнасці асноўных праблемных сітуацый у грамадстве і жыцці канкрэтнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавека адлюстроўваецца перыядычнасць гістарычнай эвалюцыі. Выкарыстанне вобраза Прадславы, якая з’яўляецца «ў пераўвасобленым, але пазнавальным выглядзе» [2, с. 20] у пераломныя гады айчыннай гісторыі (1864, 1918, 1922), акрэслівае канцэптуальны цэнтр аўтарскага бачання ролі заступніцы: духоўны пачатак, ідэі гуманнасці, служэння найвышэйшаму ідэалу закладзены генетычна, пераходзяць па спадчыне. Яны перадаюцца людзям, надзеленым моцным стваральным патэнцыялам, якія «абраны» дзеля сцвярджэння Боскай прысутнасці ў зямным чалавечым існаванні. Так, Прадслава-Еўфрасіння нясе ідэю ўсёдаравальнасці, дабрыні і міласэрнасці і ўласным прыкладам жадае *«паказваць свайму люду, як трэба жыць і куды трэба ісці»* [7, с. 305]. Прадслава ў А. Дударава паўстае як рэальная гістарычная асоба і як сімвалічнае ўвасабленне духоўнасці, дабрачыннасці і адданасці Вышэйшай ісціне.

Такім чынам, вобраз Еўфрасінні Полацкай у беларускай літаратуры прадстаўлены ў выглядзе двух асноўных канцэптуальных падыходаў: з аднаго боку, Еўфрасіння выступае як асветніца, падзвіжніца, неардынарная асоба з нялёгкім, незвычайным лёсам, як сімвал духоўнасці беларусаў, а з другога − аўтары ўносяць у вобраз патронкі натуралістычныя рысы звычайнай жанчыны, якая ўсё жыццё перамагае ў сабе першародныя пачаткі дзеля спасціжэння вышэйшай Боскай духоўнасці
і святасці.

1. *Анталогія* даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 1015 с.

2. *Аўдоніна, Т.* Час пакаяння і даравання, ці Вяртанне да духоўных каштоўнасцей (духоўна-рэлігійная аснова драмы А. Дударава «Крыж») / Т. Аўдоніна // Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу : матэрыялы рэсп. навук. канф., Мінск, 31 мая 2004 г. / рэдкал.: І. Г. Баўтрэль [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 18–23.

3. *Бацькаўшчына :* зб. гіст. літ. / уклад., прадм., паслясл. С. Панізніка. – Мінск : Юнацтва, 1998. – 335 с.

4. *Бондар, Т.* Спакуса : раман / Т. Бондар. – Мінск : Юнацтва, 1989. – 398 с.

5. *Грамадчанка, Т. К.* Сучасны беларускі раман: дынаміка жанру / Т. К. Грамадчанка. – Мінск : БДПУ, 2006. – 234 с.

6. *Дамарад, І.* «Князёўнай полацкаю пачаты…»: аповесць «Прадыслава» Вольгі Іпатавай / І. Дамарад // Роднае слова. – 2004. – № 8. – С. 8–11.

7. *Дудараў, А.* Князь Вітаўт : п’есы / А. Дудараў. – Мінск : Мастац. літ., 2005. – 318 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ